ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
«ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ,
МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ»

УДК 398.3 (= 161.3) (043.3)

**ШАТАРАВА**
**Марыя Аляксандраўна**

# БЕЛАРУСКАЯ АКАЗІЯНАЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ ЯК АДМЕТНЫ ТЭКСТ: ЗМЕСТ, ФУНКЦЫЯ, СЕМАНТЫКА

Аўтарэферат дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

па спецыяльнасці 10.01.09 – Фалькларыстыка

Мінск, 2022

Работа выканана ва ўстанове адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік: | **Лозка Алесь Юр’евіч**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт |
| Афіцыйныя апаненты: | **Шарая Вольга Мікалаеўна**, доктар філалагічных навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела народазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі |
| | **Кастрыца Алена Аляксандраўна**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры рускай і сусветнай літаратуры УА “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны” |
| Апаніруючая арганізацыя: | **УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”** |

Абарона адбудзецца 27 кастрычніка 2022 года ў 11.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.01 у ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2, пакой 302, e-mail: bel-centre@bas-net.by; тэл. вучонага сакратара (017) 284-29-24).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”.

Аўтарэферат разасланы “27” верасня 2022 года.

Вучоны сакратар савета па абароне
дысертацый Д 01.42.01
доктар гістарычных навук, дацэнт А. В. Гурко

# УВОДЗІНЫ

Беларуская абраднасць з’яўляецца важнай часткай народнай культуры, сапраўдным скарбам духоўнай спадчыны. Яна ўяўляе сабой гарманічна арганізаваную сістэму жыццёвых правіл, норм, вераванняў, рытуалаў, працоўных навыкаў, якія абумоўлены асаблівасцямі светаўяўлення беларускага народа ў розныя гістарычныя часы. Даследаванне беларускай абраднасці садзейнічае захаванню і папулярызацыі народных традыцый, духоўных каштоўнасцей, якія вызначаюць жыццяздольнасць нацыі.

На фоне шырокага аналізу каляндарных і сямейных абрадаў, іх песеннага напаўнення, семантыкі і паэтыкі мастацкіх вобразаў аказіянальная абраднасць яшчэ недастаткова даследавана. Нягледзячы на пэўную колькасць запісаў XIX – XXI стагоддзяў, артыкулаў, яна ніколі не была аб’ектам спецыяльнага даследавання.

З семіятычнага пункту гледжання аказіянальная абраднасць – своеасаблівы магічны тэкст з акцыянальна-вербальным сюжэтам, звязаным з узнікненнем асаблівых крызісных сітуацый: засухі, навальніцы, моцных маразоў, эпідэмій, пажараў, ваенных дзеянняў і г. д. Кожны від аказіянальнай абраднасці ўяўляе сабой адметны тэкст, які складаецца з пэўных акцыянальных, атрыбутыўных, вербальных і іншых кампанентаў.

Практыка сведчыць, што вывучэнне народных абрадаў і звычаяў, выкарыстанне традыцыйных элементаў у адукацыі, быце, лічбавай прасторы і іншых сферах садзейнічае гарманічнаму развіццю асобы, грамадства і дзяржавы. У народнай культуры заключаны вечныя гуманістычныя каштоўнасці, ідэалы і памкненні беларусаў. Такія катастрафічныя выклікі сучаснасці, як пандэміі, эпідэміі, змяненні клімату і іншыя, прымушаюць больш уважліва прыглядацца да сферы народнай культуры, скіраванай на нейтралізацыю неспрыяльных умоў жыцця і супрацьстаянне прыродным з’явам, негатыўным для вынікаў працоўнай дзейнасці.

Вывучэнне беларускіх аказіянальных абрадаў з’яўляецца перспектыўным у плане рэканструкцыі архаічнага пласта беларускай традыцыйнай культуры, карыснай у межах даследавання ўсяго славянскага фальклору. Даследаванне аказіянальнай абраднасці дапамагае раскрыць сутнасць і змест язычніцкіх уяўленняў аб прыродных стыхіях і эпідэмічных хваробах, дазваляе глыбей зразумець сістэму светаўспрымання нашых продкаў.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыйнае даследаванне мае цесную сувязь з дзяржаўнай комплеснай

праграмай “Даследаванне мастацтва, фальклору і этнакультурных традыцый Беларусі ў кантэксце славянскіх культур (культура)”, дзяржаўнымі праграмамі навуковых даследаванняў “Гісторыя, культура, грамадства, дзяржава” (паст. Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 09.06.2010 № 886), “Народная культура: гістарычныя традыцыі і культурныя паралелі” (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20014676), тэмамі “Беларускі фальклор у агульнаславянскім кантэксце” (нумар дзяржаўнай рэгістрацыі 20012251), “Кантэкст: беларуская культура ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне” (20014676), “Духоўная культура беларусаў у кантэксце славянскай супольнасці” (20032267).

Тэма дысертацыі адпавядае напрамку фундаментальных навуковых даследаванняў “Філасофска-светапоглядныя передумовы і логіка-эканамічныя асновы грамадскага прагрэсу і сацыяльнай устойлівасці, развіцця асобы, культуры і адукацыі, фарміравання ідэалогіі беларускага грамадства” (п. 10.2 “філасофска-светапоглядныя і логіка-метадалагічныя асновы даследавання праблем натуральна-навуковай і гуманітарнай накіраванасці, гісторыя філасофскага, сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і духоўнага жыцця беларускага грамадства”), абазначаным у “Пераліку прыярытэтных напрамкаў фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2006–2010 гады” (зацверджаны Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 17.05.2005 г., № 512), напрамку навуковых даследаванняў “Сацыяльна-эканамічнае і духоўна-культурнае развіццё Рэспублікі Беларусь” (п. 11.6 “беларуская нацыя, працэсы яе генэзіса, развіцця і ўмацавання беларускай дзяржанасці, нацыянальная, соцыякультурная, канфесійная ідэнтычнасць у кантэксце сучасных інтэграцыйных працэсаў”), прадстаўленым у “Пераліку прыярытэтных напрамкаў навуковых даследаванняў Рэспублікі Беларусь на 2011–2015 гады” (зацверджаны Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь 19.04.2010 г., № 585). Даследаванне звязана з тэмай навуковых даследаванняў “Фальклор Беларусі XX–XXI стагоддзя: жанрава-рэгіянальнае вывучэнне” (№ дзяржаўнай рэгістрацыі 20078523, навуковы кіраўнік – У.А.Васілевіч), якая ажыццяўлялася на кафедры этналогіі і фальклярыстыкі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” у 2006-2010 гг.

**Мэта і задачы даследавання**. *Мэтай* даследавання з’яўляецца выяўленне структуры і змястоўнай напоўненасці аказіянальных абрадаў як адметнага тэксту. Для дасягнення пастаўленай мэты ў рабоце вырашаюцца наступныя *задачы*:

1) вызначыць комплекс дамінантных прыкмет, уласцівых для беларускіх аказіянальных абрадаў, і характар іх сувязі з абрадамі каляндарнага і сямейнага цыклаў;

2) раскрыць адметнасці і функцыі базавых кампанентаў у складзе беларускіх аказіянальных абрадаў;

3) класіфікаваць беларускія аказіянальныя абрады паводле той крызіснай сітуацыі, якая выклікала іх правядзенне і абумовіла неабходную структуру тэксту;

4) вызначыць перадумовы і напрамкі трансфармацыі беларускіх аказіянальных абрадаў у працэсе гістарычнага развіцця;

5) выявіць жанравы склад славесных твораў аказіянальнай абраднасці, іх функцыю і семантыку матываў.

**Аб’ектам** даследавання з’яўляецца беларуская аказіянальная абраднасць як адметны тэкст.

**Прадметам** даследавання выступае тэматычны змест, дамінантныя прыкметы беларускіх аказіянальных абрадаў і асаблівасці іх кампанентаў, а таксама шляхі трансфармацыі аказіянальнай абраднасці.

**Навуковая навізна.** Упершыню ў беларускай фалькларыстыцы праведзена комплекснае даследаванне аказіянальнай абраднасці ў адзінстве спецыфічных рысаў і праяўленняў, што дазволіла інтэрпрэтаваць яе як самабытную з’яву ў традыцыйнай культуры, функцыянальна скіраваную на нейтралізацыю стыхійных праяў рэальнага свету. Упершыню цэласна ахарактарызаваны склад аказіянальных абрадаў і іх розныя віды: раскрыты дамінантныя прыкметы, выяўлена спецыфіка кампанентаў; абгрунтаваны навуковы прынцып класіфікацыі беларускіх аказіянальных абрадаў і звычаяў; акрэслены сацыяльна-гістарычныя прычыны і напрамкі структурнай і змястоўнай трансфармацыі беларускіх аказіянальных абрадаў; выяўлены і прааналізаваны славесныя жанры ў складзе беларускіх аказіянальных абрадаў і іх спецыфіка, раскрыты адметнасці мастацкіх сродкаў вербальных тэкстаў беларускіх аказіянальных абрадаў.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону.**

1. Аказіянальныя абрады з'яўляюцца нерэгулярнай часткай беларускага абрадавага комплексу, яны ўяўляюць сабой сукупнасць традыцыйных рытуальных дзеянняў, магічных тэкстаў, атрыбутаў (прадметаў і жывых істот) і ў сваім адзінстве ўзнаўляюцца толькі пры неабходнасці ці ўзнікненні крызісных сітуацый. Вызначаныя прыкметы дазваляюць разглядаць беларускія аказіянальныя абрады як асобны тып. Непарыўная сувязь з пэўнай крызіснай ці крытычнай сітуацыяй, вера ў дзейснасць кананічнага сцэнарыя правядзення абраду, тэмпаральная і магічная спецыфіка, ахоўная і ачышчальная мэтанакіраванасць з’яўляюцца характэрнымі асаблівасцямі, якія вызначаюць адметнасць і сутнасць аказіянальных абрадаў.

2. Аказіянальныя абрады ўяўляюць сабой сінкрэтызм рытуальных дзеянняў, вербальных формул, магічных прадметаў і іншых, якія ў сваёй

адметнасці цесна звязаны з прычынай правядзення абраду – крызіснай сітуацыяй. Абрадавыя кампаненты ўзаемазвязаны і функцыянальна накіраваныя на 1) высвятленне прычыны крызісу (яго віноўніка); 2) ачышчэнне і 3) ахову лакальнай тэрыторыі ад уздзеяння дэструктыўных сіл.

3. У адпаведнасці са спецыфікай крызіснай сітуацыі вызначаюцца наступныя групы аказіянальных абрадаў: метэаралагічныя – супраць катаклізмаў надвор'я (моцны мароз, дождж, засуха, навальніца, бура, гром і іншыя), ахоўна-лекавыя – супраць эпідэміі, пандэміі, эпізаотыі, бытавыя – пры будаўніцтве хаты, пажары, капанні калодзежа, сацыяльна скіраваныя – пры ваенных дзеяннях.

4. У працэсе гістарычнага развіцця беларускія аказіянальныя абрады рэдукаваліся і папаўняліся новымі кампанентамі. Змяненні адбываліся пад уздзеяннем рэлігійных, сацыяльна-палітычных, ментальна-псіхалагічных прычын. Працэс пераўтварэння закранаў атрыбутыўны апарат, функцыянальную накіраванасць, сферу бытавання абрадаў, драматызацыю дзеянняў.

5. Для беларускай аказіянальнай абраднасці ўласцівы сінтэз гетэрагенных магічных тэкстаў. Вербальны кампанент аказіянальных абрадаў уключае наступныя традыцыйныя жанры: заклінанні, галашэнні, прыгаворы, замовы, да якіх далучаюцца малітвы, малітвы-імправізацыі і царкоўныя песні. Дзякуючы напаўненню хрысціянскімі кампанентамі, язычніцкія аказіянальныя абрады захавалі жыццяздольнасць, што не перашкаджала пераходу пэўных вербальных тэкстаў у іншыя жанравыя сістэмы. Тым самым некаторыя старажытныя элементы абраднасці захоўваліся надалей. Іх атрыбуцыя адбываецца з дапамогай параўнальна-гістарычнага метаду.

**Асабісты ўклад саіскальніка**. Дысертацыя з’яўляецца самастойнай навуковай працай, усе матэрыялы, палажэнні і вынікі якой распрацаваны без суаўтарства з іншымі даследчыкамі. Асабісты ўклад саіскальніка заключаецца ў тым, што ўпершыню ў айчыннай фалькларыстыцы:

– праведзена комплекснае даследаванне беларускіх аказіянальных абрадаў і звязаных з імі вербальных тэкстаў, тэарэтычна абгрунтавана вылучэнне аказіянальнай абраднасці як адметнага тыпу беларускіх абрадаў;

– абгрунтаваны прынцыпы класіфікацыі беларускіх аказіянальных абрадаў і звычаяў згодна з крызіснымі сітуацыямі, якія выклікалі іх правядзенне;

– вылучаны дамінантныя прыкметы, уласцівыя для беларускіх аказіянальных абрадаў, прааналізавана спецыфіка кампанентаў аказіянальнай абраднасці;

– раскрыты рэлігійныя, сацыяльна-палітычныя і ментальна-псіхалагічныя прычыны, а таксама напрамкі трансфармацыі беларускіх аказіянальных абрадаў у працэсе гістарычнага развіцця;

– выяўлены жанравы склад славесных твораў беларускіх аказіянальных абрадаў, прааналізаваны адметныя мастацкія сродкі.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Вынікі даследавання дысертацыйнай работы апрабаваны на *міжнародных навуковых і навукова-практычных канферэнцыях*: X Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", Мінск, 24 – 26 мая 2004 г.), "VI Танкаўскія чытанні. Да 125-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа і 95-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка" (УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", Мінск, 26 – 27 кастрычніка 2007 г.), III Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Фальклор і сучасная культура" (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, 21 – 22 красавіка 2011 г.), V Міжнародная навуковая канферэнцыя "Аўтэнтычны фальклор: праблемы вывучэння, захавання, перайманне" (УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", Мінск, 29 красавіка 2011 г.), III Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Фальклор і сучасная культура" (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, 21–22 красавіка 2011 г.), Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Мастацтва і асоба" (УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", Мінск, 22-23 лютага 2012 г.), II Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Мастацтва і асоба" (УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", Мінск, 24 красавіка 2013 г.), III Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Актуальныя праблемы мастацтва: гісторыя, тэорыя, методыка" (УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", Мінск, 10 – 11 красавіка 2014 г.), III Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Мастацтва і асоба" (УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", Мінск, 27 мая 2015 г.), IV Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Мастацтва і асоба" (УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", Мінск, 26 – 27 кастрычніка 2016 г.), IV Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Актуальныя праблемы мастацтва: гісторыя, тэорыя, методыка" (УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", Мінск, 27 кастрычніка 2017 г.), V Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Мастацтва і асоба" (УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", Мінск, 14 – 15 лістапада 2018 г.), VI Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Мастацтва і асоба" (УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", Мінск, 12 – 13 лістапада 2019 г.), Усерасійская навукова-

практычная канферэнцыя з міжнародным удзелам “Культурная народная спадчына: традыцыі і сучаснасць” (ФДБАУ ВА “Маскоўскі дзяржаўны інстытут культуры”, Масква, 20 – 21 мая 2021 г.); *рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі*: Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя маладых вучоных “Адукацыя і навука ў Беларусі: актуальныя праблемы і перспектывы развіцця ў XXI стагоддзі” (УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, Мінск, 30 мая 2008 г.); *міжвузаўскай навукова-практычнай канферэнцыі*: “Традыцыі і сучаснасць у беларускай народнай культуры” (УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, Мінск, 5 красавіка 2005 г.). Агульная колькасць канферэнцый – 16.

**Апублікаванне вынікаў дысертацыі.** Вынікі і асноўныя палажэнні дысертацыі адлюстраваны ў апублікаваных 5 артыкулах у рэцэнзуемых выданнях Рэспублікі Беларусь (2,3 аўт. арк.), 1 артыкуле ў замежным навуковым выданні (0,7 аўт. арк.), 1 артыкуле ў перыядычным выданні Рэспублікі Беларусь (0,3 аўт.арк.), 14 матэрыялах канферэнцый (3,4 аўт. арк.), 3 артыкулах у энцыклапедыях (0,3 аўт. арк.), 4 вучэбных дапаможніках (7,1 аўт. арк.). Агульны аб’ём публікацый складае 14,1 аўт. арк.

**Структура і аб’ём дысертацыі.** Дысертацыя ўключае ўводзіны, агульную характарыстыку работы, тры главы, у якіх на аснове аналізу навуковых канцэпцый ствараецца тэарэтычная і метадалагічная база даследавання (I глава), аналізуецца сутнасць і семантыка аказіянальнай абраднасці, ствараецца класіфікацыя беларускіх аказіянальных абрадаў (II глава), разглядаецца спецыфіка вербальнага кампанента аказіянальнай абраднасці (III глава), заключэнне (агульным аб’ёмам 109 старонак тэксту), бібліяграфічны спіс (180 найменняў на беларускай, украінскай і рускай мовах, у тым ліку 28 публікацый саіскальніка).

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

Ва **ўводзінах** і **агульнай характарыстыцы работы** раскрываецца актуальнасць тэмы, акрэсліваецца навуковая навізна даследавання, вызначаецца сувязь з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі, фармулююцца мэта і задачы, палажэнні, якія выносяцца на абарону, акрэсліваюцца асабісты ўклад саіскальніка, апрабацыя і апублікаванасць вынікаў дысертацыі, яе структура і аб’ём.

**Першая глава** “Гістарыяграфія праблемы і характарыстыка крыніц” уключае два раздзелы, якія складаюць тэарэтычную базу, метадалагічную аснову і крыніцы даследавання. На аснове структуралісцкага падыходу раскрыта спецыфіка і сутнасць аказіянальнай абраднасці ў сістэме ўсяго

комплексу абраднасці беларусаў, вызначаны асаблівасці гістарычнай трансфармацыі беларускіх аказіянальных абрадаў і вербальных тэкстаў.

У ***першым раздзеле*** “Аказіянальная абраднасць у полі фалькларыстычных даследаванняў” па выніках аналізу тэарэтычных прац вядучых фалькларыстаў, этнографаў і лінгвістаў выяўлены метадалагічныя асновы даследавання.

Праблема збірання аказіянальных абрадаў у складзе іншых тыпаў беларускай абраднасці знаходзілася ў цэнтры ўвагі фалькларыстаў, пачынаючы з XIX стагоддзя. Асобныя абрады запісаны беларускімі і расійскімі даследчыкамі мінулага стагоддзя (П. Шпілеўскі, Е. Раманаў, П. Шэйн, А. Сержпутоўскі, М. Нікіфароўскі, М. і С. Талстыя, Дз. Зяленін, К. Чыстоў і іншыя), а таксама ўзгадваюцца ў работах сучасных фалькларыстаў і этнографаў (А. Байбурын, У. Васілевіч, М. Антропаў, Т. Валодзіна, В. Новак, У. Лобач, А. Кастрыца). Аказіянальная абраднасць у гэтых працах разглядаецца ў кантэксце ўсёй славянскай культуры, у межах аналізу розных жанраў традыцыйнай народнай культуры, у рамках разгляду асаблівасцей рытуальнага дзеяння, ужывання асобных прадметаў і інш. Базу крыніц даследавання склалі апублікаваныя і неапублікаваныя матэрыялы, некаторыя з якіх уводзяцца ў навуковы зварот упершыню. Важнымі крыніцамі для даследавання беларускай аказіянальнай абраднасці сталі матэрыялы архіва аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”. Унікальныя фальклорна-этнаграфічныя і міфалагічныя матэрыялы, сярод якіх пачэснае месца занялі запісы беларускай аказіянальнай абраднасці, былі сабраны творчым калектывам УА “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф.Скарыны” пад кіраўніцтвам В. Новак падчас фальклорна-краязнаўчых экспедыцый у розныя рэгіёны Беларусі. Яны былі апублікаваны ў некалькіх гісторыка-культурных і фальклорна-этнаграфічных зборніках. Аналіз лепшых узораў вуснай народнай творчасці, размешчаных у дадзеных выданнях, дазволіў выбраць і ахарактарызаваць розныя жанры славесных твораў аказіянальных абрадаў, выявіць дамінантныя прыкметы і спецыфіку кампанентаў беларускай аказіянальнай абраднасці.

***У другім раздзеле*** “Метадалагічныя асновы даследавання” вызначаюцца метадалагічныя падыходы да даследавання беларускай аказіянальнай абраднасці.

Метадалагічны фундамент даследавання вызначаюць тэарэтычныя працы айчынных фалькларыстаў (Т. Валодзіна, В. Шарая, В. Новак, І. Казакова, М. Антропаў, У. Васілевіч) і літаратуразнаўцаў (Н. Гілевіч, В. Коўтун, В. Рагойша, М. Янкоўскі), савецкіх і расійскіх даследчыкаў фальклора

(А. Байбурын, К. Чыстоў), а таксама савецкіх і расійскіх лінгвістаў і славістаў, якія інтэрпрэтуюць абрадавую дзейнасць у кантэксце адзінства формы і зместу (М. і С. Талстыя, М. Краўцоў). Беларуская аказіянальная абраднасць уяўляецца на трох узроўнях: пачатковым (зыходным), цэнтральным (асноўным) і апошнім (выніковым), якія абумоўліваюць структурную будову комплексу і ўзаемасувязі абрадавых кампанентаў. Дадзеная структура раскрывае логіку залежнасці абрадавых элементаў ад першаасновы – крызіснай сітуацыі, якая выклікала неабходнасць правядзення абрадаў, а таксама цэласнасць і ўстойлівасць усяго аказіянальнага абраду.

Вывучэнне аказіянальнай абраднасці праведзена з апорай на структуралісцкі, аксіялагічны, фенаменалагічны і комплексны падыходы, якія вызначаюць даследаванне дадзеных артэфактаў традыцыйнай культуры як сістэмы базавых каштоўнасцей і феноменаў свядомага жыцця. Адметнасць беларускай аказіянальнай абраднасці выяўляецца ў відавочнай наяўнасці і трываласці ў ёй найбольш архаічных элементаў традыцыйнай культуры, якія ўтрымліваюць вечныя і бясспрэчныя каштоўнасці жыцця.

Інструментарый даследавання вызначыла спалучэнне агульнанавуковых метадаў (аналізу, параўнання, структурнага мадэлявання, класіфікацыі, індукцыі і дэдукцыі), стандартнага метаду даследавання ў галіне гуманітарных навук – кантэнт-аналізу, а таксама спецыфічных метадаў (гістарычнай рэтраспекцыі, семіятычнага), якія выкарыстоўваліся пры аналізе аказіянальнага абраду як тэксту з вербальнымі, прадметнымі, акцыянальнымі і іншымі кампанентамі.

Асноўнымі праблемнымі аспектамі, звязанымі з вызначэннем спецыфікі беларускай аказіянальнай абраднасці, з’явіліся наступныя: вылучэнне асноўных фактараў для характарыстыкі асобных груп абрадаў,  вызначэнне і сцвярджэнне комплекснага падыходу да вывучэння аказіянальнай абраднасці, яе відавая дыферэнцыяцыя, абумоўленая спецыфікай крызісу.

У **другой главе** “Аказіянальная абраднасць: сутнасць, спецыфіка, склад у прызме часу”, якая складаецца з чатырох раздзелаў, аналізуюцца семантыка і дамінантныя прыкметы аказіянальных абрадаў, вызначаецца характарыстыка кампанентаў аказіянальнай абраднасці, вылучаецца класіфікацыя беларускіх аказіянальных абрадаў і звычаяў, акрэсліваюцца асаблівасці, перадумовы і напрамкі змянення беларускіх аказіянальных абрадаў у гістарычным развіцці.

У ***першым раздзеле*** “Аказіянальная абраднасць у сістэме беларускага абрадавага комплексу” вызначаецца месца аказіянальнай абраднасці ў сістэме беларускага фальклорнага комплексу і яе ўзаемаадносіны з іншымі тыпамі абрадаў.

Сістэма норм паводзін, што ахоплівалі ўсе сферы жыцця і ўяўлялі сабой выкананне сімвалічна-знакавых дзеянняў і вербальных тэкстаў, якія былі

абумоўлены традыцыяй, вызначаецца як абрад. Класіфікацыя беларускай абраднасці можа быць праведзена на падставе многіх фактараў, але найбольш цэласным з’яўляецца выдзяленне абрадавых тыпаў па наступных аспектах: аб’ект, час правядзення і функцыянальная скіраванасць абрадавага дзеяння. Асаблівасці дадзеных фактараў у характарыстыцы канкрэтных абрадаў дазваляюць вылучыць іх асноўныя тыпы: каляндарная, сямейная і аказіянальная абраднасць.

Найбольш архаічнай з’яўляецца аказіянальная абраднасць, што ўяўляе сабой абрады, рытуалы і вербальныя тэксты, якія праводзяцца не рэгулярна, а пры неабходнасці, звязанай з крызіснымі сітуацыямі ў жыцці чалавека. Гэты тып абраднасці цесна звязаны з магічнымі ўяўленнямі, характарызуецца асаблівым складам удзельнікаў, выбарам рытуальных прадметаў, калектыўным узаемадзеяннем з мэтай кансалідацыі сіл на барацьбу са звышнатуральнымі сіламі. Аб’ектам правядзення аказіянальных абрадаў з’яўляюцца так званыя іншыя сілы – сілы прыроды (надвор’е, стыхіі), злыя духі і нячысцікі, якія ўяўлялі сабой “іншы свет”, “чужы”, прадстаўнікі якога выклікалі крызісы і парушэнні звыклага ладу жыцця. Час правядзення аказіянальнай абраднасці быў звязаны з непасрэднай крытычнай сітуацыяй, якая яго выклікала. Абрадавыя дзеянні праводзіліся пасля крызісу з мэтай яго спынення (ачышчальная функцыя) або загадзя з мэтай яго недапушчэння, своеасаблівай прафілактыкі (ахоўная функцыя). Пры гэтым асаблівае месца сярод аказіянальных абрадаў займаюць абыдзённыя традыцыі, якія характарызуюцца тым, што абрадавы прадмет (нітка, тканіна, ручнік, хлеб), што павінен аказаць магічнае ўздзеянне на сітуацыю, павінен быць зроблены за абмежаваны час – за адзін дзень (або ноч). Абрады, якія дасягнулі неабходнага поспеху і выратавалі грамадства ад крызісу, маглі перайсці ў групу каляндарных і праводзіцца штогод у памяць пра станоўчае вырашэнне сітуацыі. Такім чынам, у якасці асноўных функцый аказіянальных абрадаў можна вызначыць ахоўную і ачышчальную. Абарона і ачышчэнне сваёй тэрыторыі ад умяшання злых сілаў ажыццяўлялася пры дапамозе выкарыстання рытуальных прадметаў, тэкстаў, дзеянняў.

У ***другім раздзеле*** “Семантыка аказіянальнай абраднасці” раскрываюцца дамінантныя прыкметы аказіянальных абрадаў і даецца характарыстыка базавых кампанентаў аказіянальнай абраднасці.

Беларускія аказіянальныя абрады характарызуюцца наступнымі спецыфічнымі прыкметамі:

1. Залежнасць формы, зместу і семантыкі абраду ад пэўнай крызіснай ці крытычнай сітуацыі, якая выклікала неабходнасць яго правядзення. Крызіс, які чалавек не мог патлумачыць, выклікаў у яго страх і жаданне шукаць незвычайныя сродкі вырашэння сітуацыі. У аснове крызісу заўсёды былі

пэўныя сілы, якім чалавек не мог супрацьстаяць звычайнымі спосабамі (пажар – агонь, навальніца – маланка, дождж – вада і г. д.). Таму для змянення крытычнай сітуацыі ён выкарыстоўваў магічныя сродкі: рытуальныя прадметы, якія неслі сімвалічны змест, магічныя словы або фразы, пры дапамозе якіх ён звяртаўся да іншых сілаў, спецыяльныя дзеянні, што дазвалялі яму абмежаваць і захаваць сваю тэрыторыю ад чужога ўмяшацельства.

2. Асабліва важным для аказіянальнай абраднасці з’яўляецца вера ў абавязковую дзейснасць правядзення абраду пры захаванні ўсіх неабходных кампанентаў і іх якасных характарыстык. Мноства правіл, канонаў і забаронаў у аказіянальных абрадах рэгламентавала іх правядзенне. У аснове знаходзілася вера ў тое, што толькі строгая адпаведнасць традыцыі прынясе адпаведны станоўчы вынік. Прызнанне дзейснасці і эфектыўнасці абраду знаходзілася ў прамой залежнасці ад захавання ўсіх неабходных кампанентаў і іх якасных характарыстык.

3. Магічны характар аказіянальных абрадаў. Паколькі аказіянальная абраднасць была накіравана на спыненне ўмяшацельства негатыўных іншых сілаў у жыццё чалавека, то адзіным магчымым сродкам супраць гэтага было выкарыстанне магічных здольнасцей чалавека, калектыву, рытуальных прадметаў, вербальных тэкстаў. Магія ў аказіянальнай абраднасці праяўляецца ў большай ступені ў параўнанні з іншымі тыпамі абрадаў. Гэта звязана, у першую чаргу, з тым, як чалавек тлумачыў прычыну з’яўлення крызісу: незразумелыя прыродныя сілы, уздзеянне іншых людзей, уздзеянне звышнатуральных сілаў і інш. Магія рытуалу або магія кожнага элемента абраду – гэта па сутнасці спосаб рэакцыі чалавека на выклікі прыроды і жыцця, яго спроба змяніць крызіс у станоўчы бок.

4. Ахоўная і ачышчальная функцыі правядзення аказіянальных абрадаў. Беларуская аказіянальная абраднасць перш за ўсё адрозніваецца часам правядзення рытуальных дзеянняў – па неабходнасці. Пры гэтым важнае значэнне мае мэтанакіраванасць рытуальных дзеянняў: абрады праводзяцца з нагоды аховы і ачышчэння “сваёй тэрыторыі” – свайго здароўя і здароўя сваёй сям’і, свайго дома, сваёй вёскі і г. д. Для розных абрадаў выбіраюцца свае сродкі і спосабы, але гэтыя функцыі застаюцца.

5. Для аказіянальнай абраднасці характэрна рухомасць працякання абрадавага часу. Выкананне аказіянальнай абраднасці па ступені неабходнасці і яе залежнасць ад кожнай крытычнай сітуацыі мае своеасаблівы ўплыў на выбар рытуальных сродкаў: выбар крытычнага часу правядзення (поўдзень ці поўнач), месца правядзення (перакрыжаванне, кут дома і інш.), выканальнікаў (цяжарныя жанчыны, старыя ці маладыя жанчыны, блізняты і інш.).

6. Узаемасувязь кампанентаў аказіянальных абрадаў цесна звязана з іх архаічным паходжаннем (з сінкрэтызмам традыцыйнай культуры), а таксама з

функцыянальнай адпаведнасцю кожнага кампанента і іх агульнай накіраванасцю на ахову і ачышчэнне. У беларускай аказіянальнай абраднасці ярка праявіўся сінтэз язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў. Хрысціянская культура ўзбагаціла абрадавы комплекс такімі элементамі, як удзел святароў у абрадах, выкарыстанне абразоў, чытанне малітваў і служэнне малебнаў, арганізацыя хрэсных хадоў, уключэнне такіх таінстваў, як асвячэнне святой вадой і іншыя. Найбольш трывалымі і ўстойлівымі язычніцкімі элементамі, якія захаваліся ў структуры аказіянальнага абраду, сталі выкарыстанне язычніцкіх сімвалаў і знакаў, культ сонца, агню і вады, надзяленне незвычайнымі магчымасцямі людзей пэўнага статусу, ахвярапрынашэнне і іншыя.

7. У розных рэгіёнах Беларусі аказіянальная абраднасць мае свае асаблівасці, звязаныя з прыроднымі ўмовамі, спецыфікай вядзення гаспадаркі і іншымі. Адрозненні датычацца ўсіх кампанентаў аказіянальнай абраднасці, асабліва вербальных тэкстаў і назваў рытуальных прадметаў і дзеянняў, што праводзіліся.

Спецыфіка аказіянальнай абраднасці ярка выяўляецца ў адметнасцях яе базавых кампанентаў:

1) Вербальны кампанент аказіянальнай абраднасці ўяўляе сабой спалучэнне славесных (тэксты і асобныя словы) элементаў. Іх выбар і асаблівасці знаходзяцца ў прамой залежнасці ад крызіснай сітуацыі, якая выклікала неабходнасць правядзення аказіянальных абрадаў. Тэксты ўтрымліваюць мальбу чалавека і ўсяго калектыву аб спыненні крызісу і дасягнення звыклага ладу жыцця. Выкананне магічных слоўных формул і асобных слоў патрабавала пэўнага сакральнага статусу выканаўцы.

2) Рытуальныя дзеянні ў складзе аказіянальных абрадаў уяўлялі сабой:

– прайграванне станоўчага выйсця з крытычнай сітуацыі (тэатралізацыю) або сімвалічнае яе – вырашэнне (з выкарыстаннем іншых прадметаў і дзеянняў, якія перадаюць характар жадаемага выніку);

– ахвяраванне стыхіям вады і агню, іншым сілам з мэтай іх задобрыць і дапамагчы чалавеку;

– дзеянні, накіраваныя на размежаванне свайго і чужога, а таксама на абмежаванне сваёй тэрыторыі ад пранікнення чужога.

Для рытуальных дзеянняў у складзе аказіянальных абрадаў характэрны магічная накіраванасць, устойлівасць і трываласць складаючых элементаў (кананічнасць), сімвалічнасць траекторыі дзеяння (па крыжы, колу), паўтарэнні (часцей, тры разы).

3) Для матэрыяльных рэчаў, якія выкарыстоўваліся ў аказіянальных абрадах, характэрны акцэнт на асаблівых абрадавых функцыях і сімвалічным змесце, рытуальным прызначэнні прадмета. Сакральнае значэнне такіх рэчаў, як ручнік, свечкі, посуд, хлебная лапата, барана, а пазней (пасля прыходу

хрысціянства) крыж, іконы, асвечаныя прадметы, тлумачыць іх асаблівае месца ў правядзенні аказіянальнай абраднасці. Магічныя якасці прадмета маглі быць вызначаны яго непасрэднай функцыяй у вядзенні гаспадаркі. Напрыклад, хлебная лапата або качарга выкарыстоўваліся ў працэсе прыгатавання ежы, значыць, яны мелі прыналежнасць да стыхіі агню, і для іх былі характэрны прадуцыруючыя якасці. Яны ў аказіянальнай абраднасці накіраваны на барацьбу супраць стыхіі вады – лапату выкідвалі з хаты, калі доўгі час ішоў дождж. З іншага боку, незвычайныя здольнасці прадмет набываў падчас здзяйснення пэўнага рытуалу. Рытуальныя забойствы жывёл і іх далейшае “пахаванне” было звязана не толькі з ахвярапрынашэннем іншым сілам, але і з ужо згаданымі ахоўнымі і ачышчальнымі функцыямі (сімвалічнае знішчэнне і выкідванне, як выгнанне нячыстай сілы са сваёй тэрыторыі).

4) Адметнасці выбару месца правядзення аказіянальных абрадаў звязаны з крызіснай сітуацыяй, якая выклікала неабходнасць іх выканання; з адпаведнасцю стыхій або іх супрацьстаянню (абрады выклікання дажджу праводзіліся каля крыніцы, ракі, возера, калодзежа, а таксама каля печы (стыхія агню) і інш.); з сакральнай прасторай, якая размяшчалася на скрыжаваннях, на памежнай тэрыторыі (паміж сваёй і чужой тэрыторыяй, паміж гэтым і тым светам).

5) Магічны характар рытуальных дзеянняў і вербальных тэкстаў быў звязаны і з асаблівымі патрабаваннямі да ўдзельнікаў аказіянальных абрадаў. Яны павінны былі адпавядаць крытэрыям рытуальнай чысціні (што звязвалася з абмежаваннямі палавых адносін, працяглай безграхоўнасцю, а часам перадавалася і праз аголенасць), а таксама сакральнай адметнасці (напрыклад, блізняты).

Такім чынам, для беларускай аказіянальнай абраднасці характэрна арганічнае ўзаемадзеянне ўсіх кампанентаў і іх трывалая сувязь з крытычнай сітуацыяй. У традыцыйным уяўленні толькі ў сваёй змястоўнай цэласнасці элементы абраду маглі эфектыўна ўздзейнічаць на іншыя сілы.

У ***трэцім раздзеле*** “Класіфікацыя беларускіх аказіянальных абрадаў і звычаяў” беларускія аказіянальныя абрады разглядаюцца ў адпаведнасці са спецыфікай крызісу, які выклікае неабходнасць правядзення абраду і вызначае адметнасці яго кампанентаў: выбар рытуальных сродкаў, удзельнікаў правядзення абрадаў, рэгламентуе часавыя і прасторавыя абмежаванні. Згодна крызіснай сітуацыі сярод беларускіх аказіянальных абрадаў можна выдзяліць:

– метэаралагічныя – абрады, выкліканыя катаклізмамі надвор’я, такімі як град, дождж, паводка, засуха, бура, навальніца, маланка, мароз;

– ахоўна-лекавыя – абрады, звязаныя са здароўем (супраць хвароб, эпідэмій, пандэмій, эпізаотый);

– бытавыя – абрады, абумоўленыя бытавымі сітуацыямі, такімі як пажар, капанне калодзежа, будаўніцтва хаты і гаспадарчых памяшканняў;

– сацыяльна скіраваныя – абрады, выкліканыя сацыяльнымі крызісамі, такія як, напрыклад, ваенныя канфлікты.

У ***чацвёртым раздзеле*** "Трансфармацыя аказіянальнай абрадавай традыцыі" вызначаюцца асаблівасці змянення аказіянальнай абраднасці ў працэсе гістарычнага развіцця, а таксама прычыны і напрамкі трансфармацыі беларускіх аказіянальных абрадаў.

Беларуская аказіянальная абраднасць у працэсе гістарычнага развіцця змянілася і ўзбагацілася новымі элементамі. Вядучымі фактарамі, якія ўплывалі на яе трансфармацыю, былі: рэлігійныя (хрысціянства, якое прынесла новыя жанры вербальнага кампанента, атрыбуты і выканальнікі абрадавых дзеянняў); сацыяльна-палітычныя (урбанізацыя, змены сацыяльнага ладу); ментальна-псіхалагічныя (пашырэнне інфармацыйнай прасторы, навуковы прагрэс, поспехі медыцыны і інш.).

Паступовы адыход грамадства ад традыцый выклікаў значныя трансфармацыйныя працэсы аказіянальнай абраднасці, якія праявіліся ў змяненнях атрыбутыўнага апарату, функцый правядзення абрадаў, узмацненні відовішчнага кампанента (драматызацыі), змяненні сферы бытавання абрадавых дзеянняў і вербальных тэкстаў. У цяперашні час аказіянальная абраднасць у сваім аўтэнтычным выглядзе захоўваецца толькі ў архіўных запісах даследчыкаў. У XXI стагоддзі ў некаторых рэгіёнах былі зроблены спробы аднаўлення аказіянальнай абраднасці. Гэта сведчыць пра тое, што аказіянальная абраднасць утрымлівае важныя элементы традыцыйнай культуры, якія могуць быць цікавымі і актуальнымі і сёння.

**Трэцяя глава** "Спецыфіка вербальнага кампанента аказіянальнай абраднасці", якая ўключае два раздзелы, прысвячаецца характарыстыцы вербальных тэкстаў беларускай аказіянальнай абраднасці.

У ***першым раздзеле*** "Жанравая разнастайнасць славесных твораў беларускіх аказіянальных абрадаў" вылучаецца жанравая разнастайнасць вербальнага кампанента аказіянальнай абраднасці. Славесныя творы мелі функцыі ўзмацнення магічнага ўздзеяння і павышэння эфектыўнасці правядзення рытуальных дзеянняў. Як і ўвесь аказіянальны абрад, так і слоўныя формулы былі цесна звязаны з крызіснай сітуацыяй, якая выклікала неабходнасць іх правядзення. Атаясамленне крызісу з антрапаморфнай істотай выклікала з'яўленне матываў выгнання, перамяшчэння ў прасторы і часе, звароту да "чалавечых" якасцяў спачування, літасці, дабрыні. Крызіснае парушэнне звыклага ладу жыцця выклікала прамаўленне слоўных формул з выкарыстаннем парогавых паказчыкаў сілы гучання – вельмі гучна або моўчкі. Моцны гук меў мэту "напужаць" або "прагнаць" крызіс, а захаванне цішыні

перш за ўсё было звязана з імкненнем не парушыць і зберагчы існуючыя сакральныя сувязі, наладжаныя падчас абрадавых дзеянняў. Асноўнымі жанрамі, якія выкарыстоўваліся ў беларускіх аказіянальных абрадах, з’яўляюцца:

– галашэнні – славесныя творы імправізацыйнага характару, якія праводзіліся пераважна сімвалічна і ў сваёй аснове мелі плач па ахвяры, што была прызначана “чужым” сілам. Галашэнні ў складзе аказіянальных абрадаў часта былі часткай тэатралізаванага дзейства, якое характарызавалася асаблівай эмацыянальнасцю і падкрэсленай трагічнасцю;

– малітвы – царкоўныя тэксты і імправізацыйныя слоўныя формулы, якія ўтрымлівалі звяртанне да Бога, Ісуса Хрыста, Маці Божай, святых з мальбой аб змяненні крызіснай сітуацыі. У складзе многіх малітваў важнае месца займалі апісанні падзей Старога Запавету (напрыклад, аб стварэнні Сусвету), біблейскіх персанажаў і г. д.;

– песні – паэтычныя тэксты з мелодыяй, якія суправаджалі рытуальныя дзеянні або выконваліся пасля іх. Сюжэтна песні былі звязаны з крызіснай сітуацыяй, утрымлівалі ўпамінанні стыхій вады і агню, звароты да іх, сімвалічнае абыгрыванне сітуацыі або выйсця з яе. Сярод песень у аказіянальных абрадах сустракаліся і царкоўныя, што ўяўлялі сабой велічальныя вербальныя тэксты, накіраваныя найчасцей да святых (апякуноў сілаў прыроды, заступнікаў людзей ад хвароб і іншых няшчасцяў);

– прыгаворы – празаічныя або вершаваныя славесныя творы, якія суправаджалі рытуальнае дзеянне праз яго апісанне, утрымлівалі матывы выгнання, аховы, ачышчэння ад злых сілаў. Даволі часта ў прыгаворах выкарыстоўваюцца моўныя формулы з малітваў, звяртанне да Бога, Ісуса Хрыста, Маці Божай, святых;

– заклінанні – цесна звязаныя з прыгаворамі вербальныя тэксты, якія ўтрымліваюць прамую ці сімвалічную пагрозу або патрабаванне напрамую да крызіснай сітуацыі або апасродкавана да яе “прадстаўнікоў” (чужых сілаў);

– замовы – вербальныя формулы, якія павінны былі магічным чынам уздзейнічаць на крызісную сітуацыю і змяніць яе. Замовы цесна звязаны з язычніцкім светапоглядам. У тэкстах замоў выяўляецца асноўная іх функцыя: магічным словам выклікаць падобнае падобным, пераўтварыць жаданае ў рэальнае.

У ***другім раздзеле*** “Хрысціянскія і язычніцкія вобразы ў славесных творах беларускіх аказіянальных абрадаў” вызначаюцца асноўныя язычніцкія і хрысціянскія вобразы, якія сустракаюцца ў вербальных тэкстах беларускай аказіянальнай абраднасці. Сярод іх вядучымі з’яўляюцца вобразы, якія былі сапраўды або ва ўяўленнях людзей звязаны з прычынамі ўзнікнення крызісных сітуацый: з’явы надвор’я (дождж, вецер, мароз, маланка і іншыя), стан здароўя

(хваробы), прыродныя стыхіі (агонь, вада, зямля, паветра), сацыяльныя крызісы (вайна). У славесных формулах крызіс або яго прычына мелі выгляд адухоўленай асобы, якая валодала чалавечымі якасцямі і пачуццямі. Другую групу вобразаў вербальных тэкстаў аказіянальнай абраднасці ўяўляюць звышнатуральныя сілы (язычніцкія ці хрысціянскія), якія маглі дапамагчы чалавеку альбо калектыву ў наладжванні звыклага ладу жыцця. У славесных творах выкарыстоўваюцца малітоўныя звароты да Бога, Багародзіцы, да святых, анёлаў, а таксама да істот народнай дэманалогіі (царыкі, багатыры, нячысцікі), якія даволі часта ўзгадваюцца побач у адным тэксце.

У ***трэцім раздзеле*** "Адметнасці мастацкіх сродкаў славесных твораў беларускай аказіянальнай абраднасці" разглядаецца паэтыка вербальных твораў беларускіх аказіянальных абрадаў, якая адрозніваецца багаццем і разнастайнасцю вобразных сродкаў выказвання. Сувязь з крызіснай сітуацыяй, што парушала спакойны лад жыцця чалавека, выклікала асаблівую эмацыянальнасць вымаўлення слоўных формул, а таксама іх мастацкую выразнасць. Для павышэння эмацыянальнага ўздзеяння славесных твораў шырока ўжываюцца эпітэты, з мэтай супастаўлення прадметаў і з'яў для выяўлення іх істотных якасцяў выкарыстоўваюцца параўнанні, магічнае ўздзеянне на крызіс павінна аказаць сімволіка лічбаў і асабовых імёнаў. У слоўных формулах аказіянальных абрадаў асаблівую мастацкую вобразнасць і эмацыянальную экспрэсіўнасць ствараюць такія прыёмы, як увасабленне, персаніфікацыя, алітэрацыя, алегорыя, гіпербала, ужыванне інтанацыйна-сінтаксічных сродкаў.

Вербальны кампанент аказіянальных абрадаў вылучаецца адметнымі паэтычнымі сродкамі, якія выяўляюць багацце і хараство народнай творчасці. Спалучэнне функцыянальнасці і мастацкасці, залежнасць ад крытычнай ці крызіснай сітуацыі, а таксама павышаная эмацыянальная афарбоўка і разнастайнасць пачуццёвай палітры з'яўляюцца асноўнымі характарыстыкамі вербальнага кампанента аказіянальнай абраднасці.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Аказіянальная абраднасць уяўляе сабой нерэгулярную частку беларускага абрадавага комплексу, якая звязана з рэакцыяй чалавека на тыя з'явы і падзеі, што парушалі звыклы ход яго жыцця і вызначаліся як крызісныя. Станоўчае вырашэнне гэтых крызісных ці крытычных сітуацый дасягалася праз звяртанне да звышнатуральных магчымасцей прыроды і іншых людзей. У комплексе беларускай абраднасці аказіянальныя абрады займаюць важнае месца. Іх вызначэнне як асобнага тыпу заснавана на залежнасці абрадавых элементаў ад крызіснай сітуацыі, тэмпаральнай і магічнай спецыфікі і ахоўна-ачышчальнай функцыі. Аказіянальныя абрады маглі пераходзіць на іншы ўзровень (у склад каляндарных абрадаў) у выпадку іх правядзення ў пэўны дзень календара ў памяць пра пераадоленне крызісу і з мэтай яго далейшага недапушчэння.

Беларуская аказіянальная абраднасць заснавана на першабытных анімістычных вераваннях, на адчуванні чалавекам сваёй залежнасці ад прыроды і дзейнасці "іншых сілаў", на якія немагчыма ажыццявіць пэўнае практычнае ўздзеянне. Аказіянальная абраднасць захавала найбольшую колькасць язычніцкіх элементаў, такіх як рытуалы ахвярапрынашэння, ачышчэнне вадою, культ сонца, магічныя заклінанні [1, 6, 7, 11, 14, 16, 18, 19, 20, 21, 22, 23, 24, 25, 26, 27, 28].

Беларуская аказіянальная абраднасць характарызуецца дамінантнымі прыкметамі, якія вызначаюць яе адметнасць.

1) Адной з самых важных прыкмет з'яўляецца прычына правядзення абрадаў дадзенага тыпу: узнікненне крызісу, які мог датычыцца не толькі асобнага чалавека, але і ўсяго калектыву. Крызісная сітуацыя магла быць звязана з разнастайнымі сферамі жыцця чалавека, аднак заўсёды яна выклікала парушэнне жыццёвага рытму, змяненне звыклага ладу. Чалавек не мог уздзейнічаць на сітуацыю звычайнымі практычнымі сродкамі, традыцыйны вопыт падказваў яму звяртанне да рытуальных спосабаў вырашэння праблемы. Абрадавыя дзеянні пры ўзнікненні крызісу былі накіраваныя на зварот да прыродных сілаў і стыхій, да свету продкаў, да Бога і хрысціянскіх святых з надзеяй на іх спрыянне.

2) Вера ў абавязковую дзейснасць правядзення абраду з'яўляецца стрыжнем аказіянальнага абраду, вызначаючы кансерватыўнасць шматлікіх яе элементаў.

3) Магічны характар аказіянальнага абрадавага дзеяння выяўляецца ў шанаванні культаў (продкаў, сонца, стыхій), веры ў звышнатуральныя магчымасці прадметаў і некаторых людзей.

4) Асноўнымі функцыямі правядзення аказіянальных абрадаў з’яўляецца ахоўная і ачышчальная. Рытуальныя дзеянні і славесныя творы былі накіраваны на абарону чалавека і яго маёмасці ад небяспечных прыродных з’яў і крызісных бытавых і сацыяльных сітуацый. Ачышчэнне ў аказіянальнай абраднасці ўяўлялася вынікам выгнання “чужых” сілаў са “сваёй” тэрыторыі пры дапамозе магічных уласцівасцей прадметаў, вербальных тэкстаў, незвычайных здольнасцяў асобных людзей.

5) Для аказіянальнай абраднасці ўласцівы своеасаблівы характар працякання абрадавага часу, што вызначаецца, па-першае, выкананнем дадзенага тыпу абраднасці па ступені неабходнасці (у выпадку наступлення ці пагрозы крызісу); па-другое, звязана з пэўнымі пагранічнымі (крытычнымі) момантамі правядзення абрадавых дзеянняў: поўдзень, поўнач, закат сонца, цэлыя суткі.

6) Правядзенне аказіянальных абрадаў вызначаецца сінтэзам сімвалічных дзеянняў, вербальных, драматычных і іншых элементаў. Кожны элемент выконвае вызначаную задачу і цесна ўзаемазвязаны з іншымі. З прыходам хрысціянства аказіянальная абраднасць узбагацілася такімі элементамі, як удзел святароў у абрадах, выкарыстанне абразоў, чытанне малітваў і асвячэнне святой вадой, служэнне малебнаў і арганізацыя хрэсных хадоў. Пры гэтым нязменнымі застаюцца такія язычніцкія элементы, як культы сонца, зямлі, агню і вады, выкарыстанне язычніцкіх сімвалаў і знакаў, надзяленне асаблівымі магчымасцямі людзей пэўнага статусу (маладых цнатлівых людзей, старых, удоў, цяжарных жанчын, блізнюкоў і г. д.), ахвярапрынашэнне (сімвалічнае або рэальнае).

7) У сувязі з рознымі прыроднымі ўмовамі, рознымі спосабамі вядзення гаспадаркі і стасункамі з жыхарамі бліжэйшых краін у аказіянальных абрадах розных рэгіёнаў адзначаецца поліварыянтнасць правядзення абрадавых дзеянняў, розны набор атрыбутаў, адрозненні вербальнага кампанента [2, 11, 14, 16, 19, 20, 22, 24, 25, 26, 27, 28].

2. Для аказіянальных абрадаў характэрна трывалая ўзаемасувязь паміж складаючымі кампанентамі: славеснымі творамі, складам выканальнікаў, іх рытуальнымі дзеяннямі, выбарам месца для правядзення, выкарыстаннем матэрыяльных рэчаў і жывых істот.

Вербальны кампанент аказіянальных абрадаў увабраў у сябе такія магічныя тэксты, як прыгаворы, заклінанні, замовы, славесныя формулы, якія выкарыстоўваліся ў мэтах звароту да тых сілаў, што павінны былі аказаць магічнае ўздзеянне на змяненне крызіснай сітуацыі. На станаўленне і развіццё

слоўных формул вялікі ўплыў аказала хрысціянства. У значнай меры хрысціянская рэлігія ўзбагацілааказіянальны вербальны кампанент і абрады ў цэлым новымі хрысціянскімі вобразамі (Хрыста, Маці Божай, святых), новай формай выканання, аднак сутнасць славесных твораў засталася нязменнай па сваёй функцыянальнай накіраванасці: яны павінны былі садзейнічаць спыненню крызісу і ўсталяванню звыклага ходу жыцця.

Аказіянальныя абрады складаліся з асобных абрадавых дзеянняў, якія ўяўлялі сабой рытуальныя рухі, што выконваліся з магічнымі мэтамі. Дзеля таго, каб сітуацыя змянілася ў лепшы бок, неабходна было сімвалічна паказаць станоўчы вынік, сімвалічна "праіграць" выйсце з крызісу. Магічная функцыя аказіянальных абрадаў абумоўлівала ўмоўнае размежаванне "свайго" і "чужога" свету, перасцярогу і недапушчэнне пранікнення і ўмешвання ў жыццёвыя працэсы негатыўных сілаў. Гэта выяўлялася ў такіх асаблівасцях абрадавых дзеянняў, як выкананне руху па колу, крыж-накрыж, асвячэнне вадой. Алгарытм дзеяння ўяўляўся наступным: высвятленне прычыны крызісу, пазбаўленне ад вынікаў крытычнай сітуацыі, ачышчэнне "сваёй" жыццёвай тэрыторыі, умацаванне межаў паміж "сваім" і "чужым" светам. Усе гэтыя этапы суправаджаліся абрадавымі дзеяннямі, якія вызначаліся ачышчальнымі і зберагальнымі функцыямі.

Вялікае значэнне ў аказіянальных абрадах мела выкарыстанне атрыбутаў. Прадметы і жывыя істоты выконвалі ў рытуальных дзеяннях своеасаблівыя ролі, адметнасцю якіх з'яўляецца іх сувязь з прыроднымі стыхіямі (хлебная лапата супраць навальніцы – вызначаецца паралель паміж нябесным агнём (маланкай) і зямным (агонь у печы)). Шырокае распаўсюджанне ў аказіянальных абрадах атрымаў рытуал ахвярапрынашэння, які быў звязаны са звяртаннем да міласці "іншых" сілаў. Ахвяраю мог быць прадмет або жывая істота, якую прыносілі ў дар дзеля дасягнення асноўнай абрадавай мэты – спынення крызісу. З прыходам хрысціянства ў аказіянальных абрадах з'явілася шмат царкоўных атрыбутаў (крыжы, іконы і інш.).

Выбар месца правядзення аказіянальнага абраду быў абумоўлены спецыфікай крызіснай сітуацыі, а таксама сакральным сэнсам рытуальнай пляцоўкі. Абрадавыя дзеянні праводзіліся каля водных аб'ектаў (ракі, возера, крыніцы, калодзежа), на палях, на дарогах, на перакрыжаваннях.

Спецыфіка адбору ўдзельнікаў абрадаў заключалася ў асаблівым сацыяльным статусе чалавека. Часцей галоўнымі выканаўцамі аказіянальных абрадаў станавіліся прадстаўнікі абшчыны, якія вызначаліся рытуальнай чысцінёй, што абумоўлівала ўдзел дзяцей, маладых дзяўчат і хлопцаў, а таксама ўдоў, салдатак, старых людзей. Узроставыя абмежаванні ўдзельнікаў былі звязаны з тым, што ўдзел маладых і цнатлівых дзяўчат або хлопцаў побач са старымі людзьмі ўяўляў сабой сімвалічную падобнасць да дзвюх фаз жыцця:

маладосць – сталасць, што мела сакральны сэнс пры правядзенні аказіянальных абрадаў. Уплыў хрысціянства на выбар выканаўцаў абрадаў вызначыўся ў тым, што ў правядзенні рытуальных дзеянняў сталі прымаць удзел духоўныя асобы, якія занялі вядучую пазіцыю.

Такім чынам, абрадавыя кампаненты ў сваёй сукупнасці былі накіраваныя на магічнае ўздзеянне на прыродную стыхію або з'яву, якая звязана з прычынай з'яўлення крызіснай сітуацыі, з мэтай змянення парушэнняў рытму існавання чалавека ў свеце і ўладкавання гарманічнага жыцця [2, 4, 13, 16, 25].

3. Спецыфіка аказіянальных абрадаў цесна звязана з характэрнымі асаблівасцямі асноўнай прычыны іх правядзення: крытычнай сітуацыі, якая можа датычыцца розных сфер жыцця – прыродных з'яў, здароўя чалавека ці свойскай жывёлы, бытавых сітуацый і сацыяльных крызісаў. У залежнасці ад гэтага можна ўмоўна падзяліць аказіянальныя абрады на некалькі груп: метэаралагічныя, ахоўна-лекавыя, бытавыя, сацыяльна скіраваныя.

Метэаралагічныя аказіянальныя абрады праводзіліся падчас узнікнення катаклізмаў надвор'я, якія былі небяспечнымі для чалавека і яго гаспадаркі (моцны мароз, дождж, засуха, навальніца, бура, гром, маланка). Выкананне абрадаў, якія павінны былі ўздзейнічаць на прыродныя з'явы, звязвалася з шанаваннем дзвюх стыхій – воднай і агнявой. Гэта вызначала спецыфіку абрадаў у дачыненні да выкарыстання прадметаў, якія мелі сімвалічнае дачыненне да вады або агню, выканання рытуальных слоўных формул са зваротам да названых стыхій (або канкрэтных прыродных з'яў), правядзення абрадавых дзеянняў, накіраваных на наладжванне магічных сувязяў паміж зямнымі і нябеснымі эквівалентамі воднай і вогненнай стыхій.

Ахоўна-лекавыя аказіянальныя абрады, якія праводзіліся з нагоды сітуацый, звязаных са здароўем чалавека або свойскай жывёлы, мелі ачышчальны характар. Яны былі накіраваныя на вызначэнне "іншых сілаў", у выглядзе якіх уяўлялася хвароба, і на абмежаванне сваёй жыццёвай тэрыторыі дзеля пазбаўлення ад негатыўнага ўплыву. Такія абрады выконваліся з выкарыстаннем спецыяльных магічных сродкаў, якія былі заклікаваны абараніць і ачысціць чалавека і яго жыллёвую прастору, а таксама садзейнічаць далейшаму нераспаўсюджванню крызіснай сітуацыі. З гэтай мэтаю ўжываліся рытуальныя рэчы, якія мелі сакральны сэнс (напрыклад, "абыдзённы" ручнік), абрадавыя дзеянні, накіраваныя на сімвалічнае абмежаванне тэрыторыі хаты, двара або вёскі.

Правядзенне бытавых аказіянальных абрадаў было звязана з узнікненнем крызісных сітуацый, якія датычыліся гаспадарчай дзейнасці чалавека (будаўніцтва хаты, пажар, капанне калодзежа). Паколькі ў такіх абрадах цэнтральнае месца займала менавіта жыллёвая прастора чалавека, якая нібыта ўвасабляла неабходныя ўмовы для існавання, то яе абарона і забеспячэнне

камфорту становіцца асноўнымі абрадавымі функцыямі. Важнае месца ў правядзенні бытавых аказіянальных абрадаў займае рытуал прынясення ахвяры, які павінен забяспечыць станоўчыя адносіны іншых сілаў і іх дапамогу ва ўсталяванні і падтрыманні жыцця на неабходным узроўні. Пасля прыходу хрысціянства ў бытавых аказіянальных абрадах сталі шырока выкарыстоўвацца царкоўныя атрыбуты і вербальныя тэксты.

Сярод сацыяльных крызісаў асабліва цяжкімі для насельніцтва былі ваенныя дзеянні, якія перыядычна праходзілі на тэрыторыі Беларусі. Сацыяльна скіраваныя аказіянальныя абрады, якія выконваліся падчас вайны, былі звязаны з ахоўнай і ачышчальнай функцыямі, якія рэалізоўваліся праз магічнае замыканне прасторы (хаты, двара, вёскі), калектыўнае ўздзеянне (кансалідацыя намаганняў), ахвяраванне вышэйшым сілам (аброчная тканіна, нітка, ручнік, хлеб) [1, 8, 15].

4. Гісторыя бытавання аказіянальнай абраднасці вызначае яе шматлікія змяненні, якія былі звязаны з рэлігійнымі, сацыяльна-палітычнымі і ментальна-псіхалагічнымі прычынамі: неаднаразовай зменай рэлігійных уяўленняў людзей, неабходнасцю прыстасавання духоўнай культуры да сацыяльных і палітычных умоў, пашырэннем навуковых ведаў пра з’явы і працэсы прыроды, глабалізацыяй і інфарматызацыяй культуры. Аказіянальная абраднасць змяшчала ў сабе элементы розных культурных пластоў, якія садзейнічалі развіццю і ўзбагачэнню абрадавай культуры. Аднак працэс трансфармацыі абрадаў быў звязаны таксама з такой з’яваю, як страчванне магічнага сэнсу, што прывяло да фактычнага знікнення аказіянальнай абраднасці са сферы актыўнага ўжытку. Трансфармацыя аказіянальнай абраднасці ўяўляла сабой некалькі накірункаў: змяненні атрыбутыўнага апарату, функцыянальнай накіраванасці, сферы бытавання абрадаў, узмацненне драматызацыі. Істотнае пераўтварэнне аказіянальных абрадаў садзейнічала знікненню іх некаторых кампанентаў, а таксама пераходу захаваных элементаў у іншыя жанры беларускага фальклору, у прыватнасці, у дзіцячыя прыгаворы, прыпеўкі, заклічкі і іншыя [3, 9, 17].

5. Для вербальнага кампанента беларускай аказіянальнай абраднасці характэрны такія жанры, як галашэнні, прыгаворы, заклінанні, замовы, песні, малітвы, малітвы-імправізацыі. Для вербальнага кампанента ўласцівы імправізацыйны характар, накіраванасць на пэўны аб’ект, у якасці якога мог выступаць сам крызіс (“чужыя сілы”) або заступнікі чалавека (хрысціянскія – Ісус Хрыстос, Маці Божая, святыя, або язычніцкія – стыхіі, зоркі, сонца), апісанне рытуальных дзеянняў ці сімвалічнага абыгрывання сітуацыі або выйсця з яе ў тэксце, а таксама матывы выгнання, аховы, ачышчэння ад злых сілаў.

У славесных творах беларускіх аказіянальных абрадаў шырока ўжываюцца эпітэты, параўнанні, увасабленне, персаніфікацыя, алітэрацыя, алегорыя, гіпербала, сімволіка лічбаў і асабістых імёнаў, ужыванне інтанацыйна-сінтаксічных сродкаў.

Асаблівасці выканання вербальных тэкстаў аказіянальных абрадаў былі абумоўлены магічнай функцыяй. Гэта звязана з гучнасцю вымаўлення тэкстаў (вельмі гучна ці, наадварот, ціха), а таксама з трохразовымі паўторамі слоў або фраз. Некаторыя абрадавыя тэксты дайшлі да нашых дзён у трансфармаваным выглядзе, яны захаваліся ў дзіцячым фальклоры ў форме прыгавораў, прыпевак, заклічак і іншых жанраў [1, 2, 4, 10, 12].

## Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання атрымалі ўкараненне ў адукацыйным працэсе ўстаноў адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка" (акты ад 02.02.2021), ДУА "Сярэдняя школа № 207 г. Мінска" (акт ад 01.02.2021).

Матэрыялы даследавання выкарыстоўваюцца ў межах выкладання вучэбнага прадмета "Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)" (акт ад 01.02.2021), а таксама ўключаны ў план комплекснай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне музычнага мастацтва і сусветнай мастацкай культуры на ўзроўні I ступені атрымання вышэйшай педагагічнай адукацыі па спецыяльнасці 1-03 01 08 "Музычнае мастацтва і сусветная мастацкая культура" (акт ад 02.02.2021) і выкарыстоўваюцца пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны "Краязнаўства і музеязнаўства" (факультатыў) і ў метадычнай рабоце кафедры тэорыі і методыкі выкладання мастацтва ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка" (акт ад 02.02.2021).

Атрыманыя вынікі даследавання могуць ужывацца ў педагагічнай дзейнасці ў падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне фалькларыстыкі, культуралогіі, этнаграфіі на I і II ступенях вышэйшай адукацыі як тэарэтычны матэрыял для правядзення вучэбных заняткаў, а таксама ў вучэбна-метадычнай дзейнасці для распрацоўкі вучэбных праграм і вучэбна-метадычных дапаможнікаў.

Тэарэтычныя палажэнні дадзенага даследавання ў практычным накірунку дазволяць аптымізаваць вывучэнне разнастайных аспектаў беларускай аказіянальнай абраднасці. Яны адкрываюць перспектыву далейшага даследавання беларускага абрадавага комплексу па асобных напрамках.

## СПІС РАБОТ, АПУБЛІКАВАНЫХ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ


***Артыкулы ў рэцэнзуемых навуковых выданнях Рэспублікі Беларусь***

1. Бабчанок, М. А. Сутнасць і змест метэаралагічных аказіянальных абрадаў / М. А. Бабчанок // Весці БДПУ. Серыя 1. Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2008. – № 4. – С. 86–89.
2. Бабчанок, М. А. Вызначальныя асаблівасці аказіянальных абрадаў / М. А. Бабчанок // Весці БДПУ. Серыя 1. Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2009. – № 3. – С. 90–93.
3. Бабчанок, М. А. Трансфармацыя беларускай аказіянальнай абраднасці / М. А. Бабчанок // Весці БДПУ. Серыя 1. Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2009. – № 2. – С. 86–90.
4. Шатарава, М. А. Характарыстыка традыцыйных элементаў беларускай аказіянальнай абраднасці / М. А. Шатарава // Весці БДПУ. Серыя 1. Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2015. – № 2. – С. 73–77.
5. Шатарава, М. А. Сутнасць, спецыфіка і склад беларускай аказіянальнай абраднасці ў прызме часу / М. А. Шатарава // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. Вып. 30 / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2021. – 418 с. – С. 338–345.

***Артыкул у замежным навуковым выданні***

6. Шатарава, М. А. Народный ансамбль белорусской музыки, танца и песни «Рэй»: от традиции к искусству / Л. Е. Василеня, М. А. Шатарова // Актуальні питання мистецької освіти та виховання : науковий журнал : вип. 2 (10) / гол. ред. Ніколаї Г. Ю. – Суми : ФОП Цьома С.П., 2017. – 192 с. – С. 3–13.

***Артыкул у перыядычным выданні Рэспублікі Беларусь***

7. Бабчанок, М. А. Семантыка і змест аказіянальных абрадаў і звычаяў / М. А. Бабчанок // Весці БДПУ. Серыя 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Культуралогія. – 2006. – № 1. – С. 119–121.

***Матэрыялы канферэнцый***

8. Бабчанок, М. А. Да пытання класіфікацыі беларускай аказіянальнай абраднасці / М. А. Бабчанок // Традыцыі і сучаснасць у беларускай народнай культуры : Матэрыялы міжвуз. студ. навук.-практ. канф., Мінск, 5 красавіка 2005 года. – Мінск : МІПСА, 2006. – С. 5–6.
9. Бабчанок, М. А. Прычыны і напрамкі трансфармацыі беларускіх аказіянальных абрадаў і тэкстаў / М. А. Бабчанок // Шостыя Танкаўскія чытанні. Да 125-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа і 95-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка : зб. навук. артыкулаў / рэдкал. : Г. Я. Адамовіч [і інш.]; адк. рэд. А. І. Лугоўскі. – Мінск : БДПУ, 2008. – С. 173–174.

10. Бабчанок, М. А. Адметнасці мастацкіх сродкаў беларускіх аказіянальных тэкстаў / М. А. Бабчанок // Фальклор і сучасная культура: матэрыялы III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, 21–22 красавіка 2011 г., Мінск. У 2 ч. Ч. 1 / рэдкал. : І.С. Роўда [і інш.]. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2011. – С. 64–66.

11. Бабчанок, М. А. Аказіянальная абраднасць у сістэме комплексу абрадаў беларусаў / М. А. Бабчанок // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання: зборнік навуковых прац удзельнікаў V Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 29 красавіка – 1 мая 2011 г.) / БДУКМ; рэдкал. : М. А. Мажэйка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУКМ, 2011. – С. 61–63.

12. Бабчанок, М. А. Жанры беларускіх аказіянальных тэкстаў / М. А. Бабчанок // Мастацтва і асоба : матэрыялы Міжнар. навук. канф., г. Мінск, 22-23 лют. 2012 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М.Танка; рэдкал. : Т. С. Багданава (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2012. – С. 179–183.

13. Бабчанок, М. А. Характарыстыка кампанентаў беларускай аказіянальнай абраднасці / М. А. Бабчанок // Мастацтва і асоба : матэрыялы II Міжнароднай навук. канф., г. Мінск, 24 красавіка 2013 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя Максіма Танка ; рэдкал. Т. С. Багданава (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДПУ, 2013. – С. 4–5.

14. Бабчанок, М. А. Сістэма беларускага абрадавага комплексу / М. А. Бабчанок // Актуальныя праблемы мастацтва : гісторыя, тэорыя, методыка : матэрыялы III Міжнар. навук.-практ. канф., г. Мінск, 10–11 крас. 2014 г. / Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка ; адк. рэд. Ю. Ю. Захарына. – Мінск: БДПУ, 2014. – С. 29–32.

15. Шатарава, М. А. Семантыка беларускіх аказіянальных абрадаў, звязаных з бытавымі сітуацыямі / М. А. Шатарава // Искусство и личность : материалы III Междунар. науч.-практ. конф., г. Минск, 27 мая 2015 г. [Электронны рэсурс] / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол. : Т. С. Богданова (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2015. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

16. Шатарава, М. А. Да пытання спецыфікі беларускай аказіянальнай абраднасці / М. А. Шатарава // Искусство и личность : материалы III Междунар. науч.-практ. конф., г. Минск, 27 мая 2015 г. [Электронны рэсурс] / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол. : Т. С. Богданова (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2015. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

17. Шатарава, М. А. Трансфармацыя элементаў аказіянальнай абраднасці ў беларускім танцавальным фальклоры / М. А. Шатарава // Искусство и личность : материалы IV Междунар. науч.-практ. конф., г. Минск, 26-27 окт. 2016 г. [Электронный ресурс] / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол. :

И. И. Рыжикова (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2017. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM).

18. Шатарава, М. А. Выкарыстанне традыцый народнай педагогікі ў выхаванні нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў / Л. Я. Василеня, М. А. Шатарава // Актуальные проблемы искусства : история, теория, методика : материалы IV Междунар. научн.-практ. конф., г. Минск, 27 октября 2017 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. Максима Танка; редкол. И. И. Рыжикова (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2018. – С. 40–42.

19. Шатарава, М. А. Народное творчество в эстетическом образовании школьников : интеграция знаниевого и деятельностного компонентов (в контексте изучения предмета «Искусство (отечественная и мировая художественная культура)») / М. А. Шатарава // Искусство и личность : материалы V Междунар. научн.-практ. конф., г. Минск, 14–15 ноября 2018 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол. И. И. Рыжикова (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2018. – 300 с. – С. 123–125.

20. Шатарова, М. А. Реализация педагогического потенциала народной культуры при изучении учебного предмета «Искусство (отечественная и мировая культура)» / А. А. Рукова, М. А. Шатарова // Искусство и личность = Мастацтва і асоба = Art and Person : материалы VI Междунар. научн.-практ. конф., г. Минск, 12–13 ноября 2019 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол. И. И. Рыжикова (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2019. – С. 366–367.

21. Шатарова, М. А. Жанровая структура текстов белорусской окказиональной обрядности / М. А. Шатарова // Культурное народное наследие: традиции и современность : материалы Всероссийской научн.-практ. конф. с межд. участием, г. Москва, 20-21 мая 2021 г. / Моск. гос. ин-т к-ры. – Москва : МГИК, 2021.

### *Артыкулы ў энцыклапедыях*

22. Бабчанок, М. А. Аказіянальныя абрады / М. А. Бабчанок, А. Ю. Лозка // Беларускі фальклор : Энцыклапедыя : У 2 т. Т. 1 / Рэдкал. : Г. П. Пашкоў і інш. – Мінск : БелЭн, 2005. – С. 46.

23. Бобченок, М. А. Обряд / М. А. Бобченок, А. Ю. Лозко // Беларусь. Энциклопедия : В 6 т. Т. 5 / Редкол. : Г.П. Пашков [и др.]. – Минск : БелЭн, 2007. – С. 502–503.

24. Бабчанок, М. А. Аказіянальныя абрады / М. А. Бабчанок // Культура Беларусі. Энцыклапедыя. Т. 1 / рэдкал. : Т. У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2010. – С. 81.

### *Вучэбныя дапаможнікі*

25. Бабчанок, М. А. Беларуская фалькларыстыка : аказіянальныя абрады і паэзія : дапаможнік / М. А. Бабчанок. – Мінск : БДПУ, 2010. – 72 с.

26. Шатарова, М. А. Искусство (отечественная и мировая художественная культура) : учеб. пособие для 9-го кл. учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения : (с электронным приложением) / С. И. Колбышева, Ю. Ю. Захарина, И. Г. Томашева, Н. В. Бычкова, И. Г. Волкова, М. А. Шатарова. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2019. – 144 с. : ил. + 1 электрон. опт. диск.

27. Шатарава, М. А. Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура) : вуч. дапам. для 9-га кл. устаноў агульн. сярэдн. адукацыі з бел. мов. навучання : (з электронным дадаткам) / С. І. Колбышава, Ю. Ю. Захарына, І. Г. Томашава, Н. В. Бычкова, І. Г. Волкава, М. А. Шатарава. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2019. – 144 с. : іл. + 1 электрон. опт. дыск.

28. Шатарова, М. А. Материальная культура Беларуси / Ю. Ю. Захарина, М. А. Шатарова. – Минск : РИПО, 2020. – 239 с.

# РЭЗЮМЭ

***Шатарава Марыя Аляксандраўна***

**Беларуская аказіянальная абраднасць як адметны тэкст: змест, функцыя, семантыка**

*Ключавыя словы*: аказіянальная абраднасць, абрадавы комплекс, крызісная сітуацыя, магічнае абрадавае дзеянне, віды аказіянальных абрадаў, жанры славесных твораў аказіянальных абрадаў, вобразна-выяўленчыя сродкі.

*Мэта дысертацыі* – выяўленне структуры і змястоўнай напоўненасці аказіянальных абрадаў як адметнага тэксту.

*Метады даследавання* – навукова-тэарэтычныя: аналітычныя (структурна-лагічны, лінгвістычны і кампаратыўны аналіз), параўнаўчы, структурнага мадэлявання, класіфікацыі, індукцыі і дэдукцыі, а таксама прыватнанавуковыя (метады гістарычнай рэтраспекцыі, семіятычны, кантэнт-аналіз).

*Атрыманыя вынікі і іх навізна*. Упершыню ў беларускай фалькларыстыцы праведзена комплекснае даследаванне аказіянальнай абраднасці ў адзінстве спецыфічных рысаў і праяўленняў, што дазволіла інтэрпрэтаваць яе як самабытную з'яву ў традыцыйнай культуры, функцыянальна скіраваную на нейтралізацыю стыхійных праяў рэальнага свету. Упершыню цэласна ахарактарызаваны склад аказіянальных абрадаў і іх розныя віды: раскрыты дамінантныя прыкметы, выяўлена спецыфіка кампанентаў; абгрунтаваны навуковы прынцып класіфікацыі беларускіх аказіянальных абрадаў і звычаяў згодна крызісных сітуацый, якія выклікалі іх правядзенне: вылучаны мэтэаралагічныя, ахоўна-лекавыя, бытавыя і сацыяльна скіраваныя аказіянальныя абрады; акрэслены сацыяльна-гістарычныя прычыны і напрамкі структурнай і змястоўнай трансфармацыі беларускіх аказіянальных абрадаў; выяўлены і прааналізаваны слоўныя жанры ў складзе беларускіх аказіянальных абрадаў і іх спецыфіка, раскрыты адметнасці мастацкіх сродкаў тэкстаў беларускіх аказіянальных абрадаў.

*Рэкамендацыі па выкарыстанні*. Вынікі даследавання могуць выкарыстоўвацца ў навуковай і метадычнай рабоце, у адукацыйным працэсе.

*Галіна выкарыстання* – фалькларыстыка, этнаграфія, тэорыя і гісторыя культуры.

# РЕЗЮМЕ

*Шатарова Мария Александровна*

**Белорусские окказиональные обряды как отличительный текст: содержание, функция, семантика**

*Ключевые слова*: окказиональная обрядность, обрядовый комплекс, кризисная ситуация, магическое обрядовое действие, виды окказиональных обрядов, жанры словесных произведений окказиональных обрядов, образно-изобразительные средства.

*Цель диссертации* – выявление структуры и содержательного наполнения окказиональных обрядов как отличительного текста.

*Методы исследования* – научно-теоретические: аналитические (структурно-логический, лингвистический и компаративный анализ), сравнительный, структурного моделирования, классификации, индукции и дедукции, а также частнонаучные (методы исторической ретроспекции, семиотический, контент-анализ).

*Полученные результаты и их новизна*. Впервые в белорусской фольклористике проведено комплексное исследование окказиональной обрядности в единстве специфических черт и проявлений, что позволило интерпретировать ее как самобытное явление в традиционной культуре, функционально направленную на нейтрализацию стихийных проявлений реального мира. Впервые целостно охарактеризован состав окказиональных обрядов и их разные виды: раскрыты доминантные приметы, выявлена специфика компонентов; обоснован научный принцип классификации белорусских окказиональных обрядов и обычаев согласно кризисным ситуациям, которые вызвали их проведение: выделены метеорологические, защитно-лечебные, бытовые и социально направленные окказиональные обряды; очерчены социально-исторические причины и направления структурной и содержательной трансформации белорусских окказиональных обрядов; выявлены и проанализированы словесные жанры в составе белорусских окказиональных обрядов и их специфика, раскрыты особенности художественных средств текстов белорусских окказиональных обрядов.

*Рекомендации по использованию*. Результаты исследования могут использоваться в научной и методической работе, в образовательном процессе.

*Область использования* – фольклористика, этнография, теория и история культуры.

# SUMMARY

*Shatarova Maria Alexandrovna*

**Belarusian occasional rites as a distinctive text: content, function, semantics**

*Key words*: occasional ritual, ritual complex, crisis situation, magical ritual action, types of occasional rituals, genres of verbal works of occasional rites, figurative and visual means.

*The purpose of a thesis* – identifying the structure and content of occasional rituals as a distinctive text.

*The methods of research* – scientific theory: analytical (structural-logical, linguistic and comparative analysis), comparative, structural modeling, classification, induction and deduction, as well as private scientific (methods of historical retrospection, semiotic, content-analysis).

*Obtained results and their novelty*. For the first time in the Belarusian folklore studies, a comprehensive study of occasional ritualism in the unity of specific features and manifestations was carried out, which made it possible to interpret it as an original phenomenon in traditional culture, functionally aimed at neutralizing the spontaneous manifestations of the real world. For the first time holistically, the composition of occasional rituals and their different types are characterized: dominant signs are revealed, the specificity of the components is revealed; substantiated the scientific principle of classification of Belarusian occasional rituals and customs according to the crisis situations that caused them to be carried out: the meteorological, protective and medical, household and socially oriented occasional rituals are highlighted; outlined the socio-historical reasons and directions of the structural and substantial transformation of the Belarusian occasional rites; revealed and analyzed verbal genres in the composition of Belarusian occasional rituals and their specificity, revealed the features of the artistic means of the texts of Belarusian occasional rituals.

*Recommendations for the use*. The research results can be used in scientific and methodological work, in the educational process.

*Field of application* – folklore, ethnography, theory and history of culture.